БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 882.609 (072.3) (0433)

**(ознакомительный фрагмент)**

БАРАДЗІНА
Алена Іванаўна

# ФАРМІРАВАННЕ ГІСТОРЫКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ЛІТАРАТУРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ У. КАРАТКЕВІЧА)

13.00.02 – тэорыя і методыка навучання (беларуская літаратура)

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне навуковай ступені кандыдата педагагічных навук

Мінск -- 2000

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць даследавання.** Ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай сярэдняй школы актуалізуецца роля літаратуры, якая здольна спалучыць працэс далучэння школьнікаў да культуры свайго народа і дасягненняў сусветнай культуры з фарміраваннем у іх навуковых уяўленняў пра культурна-гістарычны вопыт народа Беларусі, а на падставе гэтага – здольнасці да эстэтычнага ўспрымання навакольнай рэчаіснасці, умення гарманізаваць свае адносіны з людзьмі, прыродай, грамадствам. Якасць гэтых адносін, а значыць, узровень цывілізаванасці грамадства, а таксама яго нацыянальнае аблічча вызначаецца ўзроўнем гістарычнай свядомасці актыўнага на сучасным этапе сацыяльнага суб'екта.

Гістарычная, ці гісторыка-патрыятычная, свядомасць з'яўляецца грунтоўным падмуркам выхавання грамадзянскасці асобы, якое надзвычай актуальна ў сённяшняй сацыяльна-эканамічнай сітуацыі. Аднак аналіз даследчых падыходаў да дадзенай катэгорыі сведчыць як пра аб'ектыўную шматграннасць вывучаемага феномена, так і пра недастатковую распрацаванасць праблемы, асабліва ў педагагічным аспекце. Доўгі час гістарычная свядомасць не выдзялялася ў структуры грамадскай свядомасці як самастойны кампанент. Абазначалася, але не даследавалася дадзеная праблема ў філасофскіх працах М.А. Бярдзяева, А.В. Ключэўскага, Дз.С. Ліхачова, А.Г. Спіркіна і інш. Першыя шляхі яе даследавання вызначылі ў канцы 60-х гадоў І.С. Кон, Ю.А. Лявада. Актывізавалася вывучэнне праблемы ў сувязі з распрацоўкай такіх катэгорый грамадскай свядомасці, як "сацыяльная памяць", "гістарычны вопыт", "гістарычнае пазнанне" (Г.А. Анціпаў, Б.Г. Магільніцкі, А.М. Рой і інш.). У апошні час у шэрагу дысертацыйных прац (А.Ф. Гаўрылаў, Р.М. Нігаматуліна, Л.Б. Падгорных, М.Ю. Шырманава) дадзены феномен акрэслены на філасофска-сацыялагічным узроўні.

Асобныя аспекты гістарычнай свядомасці, якія яднаюць яе з нацыянальнай, патрыятычнай, грамадзянскай свядомасцю, у айчыннай педагогіцы даследаваліся Л.А. Альшэўскай, Е.Г. Андрэевай, А.Л. Барчук, Д.І. Вадзінскім, Л.М. Варанецкай, А.А. Грымацем, В.П. Петуховым, І.М. Слесаравай, І.Ф. Харламавым і інш. Спецыяльных работ, прысвечаных даследаванню гісторыка-патрыятычнай свядомасці, у педагогіцы пакуль няма, недастаткова распрацаваны гэты феномен і ў методыцы выкладання літаратуры. Між тым праз эстэтычны змест літаратура як мастацтва апасродкуе, здымае ў сабе праблематыку іншых форм грамадскай свядомасці, у тым ліку і гісторыка-патрыятычнай. Гэта актуалізуе неабходнасць трансфармацыі мэт філасофскага і сацыялагічнага ўзроўню ў задачы педагагічныя, дыдактычныя. Не знайшла паслядоўнага вырашэння дадзеная праблема і ў сучаснай педагагічнай практыцы з прычыны недастатковай прадстаўленасці гістарычнай тэмы ў школьных праграмах папярэдніх

пакаленняў, адсутнасці рэкамендацый па аптымальным педагагічным кіраванні працэсам фарміравання гістарычнай свядомасці школьнікаў.

Дадзенае даследаванне грунтуецца на матэрыяле праграмных твораў 5 – 11 класаў, у прыватнасці, твораў У. Караткевіча, што абумоўлена наступнымі фактарамі: элементы мастацкага мыслення ў спалучэнні з вынікамі гістарычнага пазнання выступаюць перадумовай фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці асобы; творчасць У. Караткевіча, прызнанага майстра гістарычнага жанру, дае багатыя магчымасці для рэалізацыі педагагічнага аспекта праблемы ва ўзроставым праламленні, паколькі прадстаўлена амаль у кожным класе; у методыцы выкладання літаратуры шляхі фарміравання гістарычнай свядомасці школьнікаў, як і магчымасці інтэрпрэтацыі творчасці У. Караткевіча, даследаваны недастаткова. Пераадоленне гэтых тэндэнцый будзе спрыяць умацаванню духоўнай пераемнасці пакаленняў. Такім чынам, выбар тэмы даследавання абумоўлены актуальнасцю праблемы фарміравання гістарычнай свядомасці на сучасным этапе развіцця грамадства, недастатковай яе распрацаванасцю ў айчыннай методыцы выкладання літаратуры і надзённымі патрэбамі грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі.

**Сувязь даследавання з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Даследаванне праводзілася ў адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі Канцэпцыі рэфармавання літаратурнай адукацыі ў школах Рэспублікі Беларусь і ў рамках планавай тэмы Міністэрства адукацыі РБ, якая распрацоўвалася супрацоўнікамі лабараторыі літаратурнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі "Педагагічнае праектаванне складу і структуры зместу адукацыі па беларускай і рускай літаратуры ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе з 12-гадовым навучаннем" (1997 – 1999 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 19973844).

**Мэта даследавання** – стварэнне асобасна скіраванай метадычнай сістэмы вывучэння творчасці У. Караткевіча ў 5 – 11 класах, якая забяспечвае большую эфектыўнасць працэсу фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў.

Мэта даследавання рэалізуецца шляхам пастаноўкі і рашэння наступных **задач**.

1. Раскрыць сэнс паняцця "гісторыка-патрыятычная свядомасць", выявіць структуру дадзенага феномена і яго ўзаемасувязь з іншымі пластамі свядомасці асобы.

2. Выявіць стан сфарміраванасці гістарычнай свядомасці ў вучняў сярэдняй школы на сучасным этапе і вызначыць асноўныя тэндэнцыі яе развіцця.

3. Абгрунтаваць магчымасці роднай літаратуры і творчасці У. Караткевіча для вырашэння праблемы ў педагагічным аспекце.

4. Вызначыць найбольш выніковыя метады і прыёмы вывучэння твораў У. Караткевіча з мэтай фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў.

**Аб'ект даследавання** – фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці вучняў сярэдніх школ Рэспублікі Беларусь у працэсе літаратурнай адукацыі.

**Прадмет даследавання** – агульныя і спецыфічныя метады і прыёмы працэсу фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці вучняў 5 – 11 класаў сярэдніх школ на ўроках беларускай літаратуры пры вывучэнні творчасці У. Караткевіча.

**Гіпотэза даследавання.** Фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці вучняў сярэдніх школ будзе эфектыўным пры ўмове, калі ў працэсе літаратурнай адукацыі школьнікі будуць уключаны ў дзейнасць па асэнсаванні такіх каштоўнасцей, як Айчына, гісторыя, мова, культура, прырода, сям'я, нацыянальны характар і традыцыі, фальклор; калі пры аналізе твораў будуць улічвацца іх эстэтычны змест, выкарыстоўвацца магчымасці міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязей, стварацца ўмовы творчага навучання, а вядучымі шляхамі дзейнасці настаўніка і вучняў з'явяцца вырашэнне праблемных задач, даследчыцкая дзейнасць як сродкі спасціжэння аўтарскай пазіцыі і канцэпцыі чалавека ў творы, выяўленчых магчымасцей роднага слова.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання**

Метадалагічная аснова даследавання – філасофскія працы па праблемах дыялектыкі грамадскага жыцця і грамадскай свядомасці, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей; па асобных аспектах праблемы гістарычнай і патрыятычнай свядомасці; па праблеме ўзаемадзеяння гістарычных ведаў і сродкаў мастацтва як спосабаў фарміравання свядомасці асобы; гуманістычная тэорыя асобы; псіхалагічная канцэпцыя ўспрымання мастацкага твора як асобаснага працэсу.

Асноўныя метады даследавання: 1) тэарэтычнае асэнсаванне праблемы, фармуліроўка гіпотэзы, мэтаў і задач даследавання; 2) эмпірычныя метады здабывання фактаў навуковай інфармацыі (анкетаванне, гутарка); 3) аналіз вынікаў дзейнасці вучняў (сачыненняў і іншых пісьмовых работ) як спалучэнне колькаснага і якаснага метадаў апрацоўкі дадзеных; 4) вывучэнне і абагульненне перадавога педагагічнага вопыту.

Даследаванне ажыццяўлялася ў некалькі этапаў:

I этап (1994 – 1995 гг.). Вывучэнне і аналіз філасофскіх і літаратуразнаўчых прац, псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры; правядзенне анкетавання, зрэзавых работ; падвядзенне тэарэтычнай базы пад уласную практычную методыку.

II этап (1995 – 1996 гг.). Распрацоўка эксперыментальнай методыкі, яе апрабацыя, аналіз атрыманых вынікаў.

III этап (1997 – 1998 гг.). Правядзенне і аналіз зрэзавых работ, анкет, удакладненне вывадаў, афармленне дысертацыйнага даследавання.

**Навуковая навізна даследавання** заключаецца ў наступным: -- у трансфармацыі мэты фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці як сацыяльнай задачы ў задачу педагагічную, дыдактычную, г.зн. ажыццяўленне мэтанакіраванага ўплыву на фарміраванне навуковых уяўленняў, развіццё пачуццяў, выпрацоўку пераканаванняў і каштоўнасных арыентацый школьнікаў, звязаных з успрыманнем сацыяльнага мінулага Айчыны як устаноўкі на вызначэнне свайго месца ў соцыуме; -- у выяўленні ўзроўню гістарычнай свядомасці школьнікаў на сучасным этапе, псіхолага-педагагічных і метадычных умоў яе фарміравання; -- у вызначэнні зместу работы настаўніка і вучняў на розных этапах літаратурнай адукацыі ў святле праблемы даследавання; -- у распрацоўцы прыёмаў работы над творамі У. Караткевіча розных жанраў.

**Навуковая значнасць** атрыманых вынікаў вызначаецца тым, што на аснове тэарэтычнага і эксперыментальна-практычнага даследавання распрацавана сістэма вывучэння творчасці У. Караткевіча ў 5 – 11 класах, якая забяспечвае большую эфектыўнасць працэсу фарміравання гістарычнай свядомасці школьнікаў як адной з асноў іх грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

**Практычная значнасць даследавання.**

Пачатак распрацоўкі праблемы гістарычнай свядомасці з'яўляецца сродкам прыцягнення ўвагі да яе вырашэння як аднаго са шляхоў павышэння эфектыўнасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання, якое ўяўляецца важнейшым фактарам падрыхтоўкі маладога пакалення да паўнацэннага жыцця і дзейнасці ў сучаснай сацыяльна-эканамічнай і грамадска-культурнай сітуацыі. Вынікі даследавання, распрацаваныя методыкі знайшлі прымяненне ў навучальным працэсе сярэдніх школ, на занятках па методыцы выкладання літаратуры ў педкаледжы, у час педагагічнай практыкі навучэнцаў, скарыстаны для стварэння метадычнага дапаможніка.

**Сацыяльна-эканамічная значнасць** атрыманых вынікаў звязана з тым, што распрацаваная аўтарам методыка вывучэння творчасці У. Караткевіча ў 5 – 11 класах дазволіць інтэнсіфікаваць працэс літаратурнай адукацыі, стымуляваць працэсы самарэалізацыі і самасцвярджэння асобы вучня праз развіццё яе інтэлектуальных і творчых здольнасцей.

**Асноўныя палажэнні, што выносяцца на абарону:**

1. Фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці ў сукупнасці яе кагнітыўнага, афектыўнага і паводзіннага кампанентаў сродкамі літаратуры ажыццяўляецца на аснове авалодання школьнікамі наступнымі ўменнямі:

– успрымаць карціну жыцця, намаляваную пісьменнікам, як сродак развіцця канцэптуальнага погляду на навакольную рэчаіснасць;

– успрымаць сістэму вобразаў герояў як умову пашырэння і ўзбагачэння падлеткамі ўласнага жыццёвага вопыту;

– асэнсоўваць працэс станаўлення асобы літаратурнага героя як умову стымулявання і развіцця патрэбы ў самавыхаванні.

2. Узровень сфарміраванасці гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў вызначаецца асэнсаваннем асноўных этапаў айчыннай гісторыі, увасобленых у творах літаратуры; наяўнасцю ацэначных адносін да сацыяльнага мінулага і гістарычных каштоўнасцей Айчыны; пэўным ўзроўнем ідэнтыфікацыі вучнямі ўласнай асобы з маральнымі ўзорамі гістарычнай рэчаіснасці; усведамленнем актуальнасці агульначалавечага зместу літаратурных вобразаў; сфарміраванасцю грамадзянскіх, патрыятычных пачуццяў. Ён дасягаецца рэалізацыяй метадаў і прыёмаў фарміравання свядомасці ў іх спалучэнні з прыватнаметадычнымі формамі выкладання літаратуры на аснове даследчай і творчай дзейнасці вучняў (у тым ліку пазнавальнай дзейнасці міжпрадметнага характару), якая спрыяе самарэалізацыі і самасцвярджэнню асобы, пераўтварэнню пачуццяў і ўяўленняў у перакананні.

**Асабісты ўклад аўтара** ў распрацоўку праблемы заключаецца ў абагульненні педагагічнага вопыту, у тым ліку ўласнага, выкладання літаратуры ў сярэдняй школе і ў педкаледжы, вопыту кіраўніцтва педагагічнай практыкай навучэнцаў педкаледжа; у распрацоўцы асобных аспектаў методыкі выяўлення ўзроўню гістарычнай свядомасці школьнікаў; у распрацоўцы скіраванай на рэалізацыю гуманістычных прынцыпаў вучэбна-выхаваўчага працэсу методыкі вывучэння творчасці У. Караткевіча; у стварэнні і ўкараненні вучэбна-метадычнага дапаможніка для настаўнікаў беларускай літаратуры.

**Апрабацыя вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вынікі праведзенага даследавання абмяркоўваліся на пасяджэннях лабараторыі літаратурнай адукацыі НІА, кафедры гуманітарных навук Баранавіцкага дзяржаўнага вышэйшага педагагічнага каледжа, дакладваліся аўтарам на навукова-практычных канферэнцыях, выкладаліся ў публікацыях. Матэрыялы даследавання знайшлі прымяненне ў распрацоўцы лекцыйнага курса і практычных заняткаў па гісторыі і методыцы выкладання літаратуры для навучэнцаў педкаледжа. Эксперыментальнае навучанне праводзілася ў перыяд з 1994 па 1998 гг. у сярэдняй школе №2 г. Слоніма Гродзенскай вобласці, гімназіі №1 г. Баранавічы, Жыліцкай СШ Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Эксперыментам было ахоплена 410 школьнікаў.

**Апублікаванасць вынікаў.** Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 11 публікацыях аўтара. Агульная колькасць старонак апублікаваных матэрыялаў -- 105. Усе работы напісаны без сааўтараў. Сярод падрыхтаваных публікацый вучэбна-метадычны дапаможнік – 1, артыкул у зборніку навуковых прац – 1, артыкулаў у навуковых часопісах – 6, матэрыялаў канферэнцый – 3.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, двух раздзелаў, вывадаў па раздзелах, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, які змяшчае 229 назваў, 3 дадаткаў.

Поўны аб'ём дысертацыі складае 126 старонак, асноўны тэкст – 100 старонак, 13 старонак -- спіс выкарыстаных крыніц, 13 старонак – дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** даецца абгрунтаванне выбару тэмы ў святле задач, якія стаяць на сучасным этапе перад школай, растлумачана неабходнасць даследаванняў па дадзенай праблеме.

У **"Агульнай характарыстыцы работы"** раскрываецца актуальнасць праведзенага даследавання, вызначаны яго мэта, задачы, прадмет, аб'ект, вылучана гіпотэза; паказаны навуковая навізна, тэарэтычная значнасць і адукацыйна-практычнае значэнне атрыманых вынікаў, сфармуляваны палажэнні, што выносяцца на абарону.

Першы раздзел – **"Тэарэтычныя асновы праблемы"** – уключае тры параграфы, у першым з якіх раскрываецца змест паняцця "гістарычная свядомасць" у філасофскім, сацыяльным і педагагічным аспектах, у другім – даследуецца дыялектыка навукова-гістарычных ведаў і сродкаў мастацкай вобразнасці ў творах гістарычнай тэматыкі, у трэцім – абгрунтоўваецца мэтазгоднасць выкарыстання пэўных форм работы на ўроках літаратуры, у першую чаргу метадаў і прыёмаў фарміравання свядомасці ў іх адзінстве з формамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці міжпрадметнага характару.

Гістарычная свядомасць – неабходны спосаб асваення гістарычнай рэальнасці, якое мае апору на гісторыю Айчыны, што дазваляе карыстацца паняццямі "гістарычная" і "гісторыка-патрыятычная свядомасць" як раўназначнымі. Гэта дыялектычнае адзінства гістарычных ведаў і ацэнак мінулага, у выніку чаго фарміруюцца каштоўнасныя арыентацыі асобы.

Пад уздзеяннем гісторыі нацыі фарміруецца нацыянальная самасвядомасць (Л.А. Альшэўская); дасягнуты ўзровень гістарычнай свядомасці – адзін з крытэрыяў патрыятычнай выхаванасці (А.Л. Барчук); свядомасць ёсць маральнае і сацыяльна-псіхалагічнае вымярэнне грамадзянскасці (В.Н. Петухоў). Вырашаючы задачы фарміравання гістарычнай свядомасці, мы тым самым уплываем і на іншыя пласты свядомасці асобы, ствараючы перадумовы для яе самарэалізацыі, што ўяўляе сабой працэс фарміравання гуманістычнай свядомасці, якая ёсць не што іншае, як духоўнасць. А "мера духоўнага развіцця асобы – гэта тая ступень, у якой асоба можа прадстаўляць свой час, свой народ, нацыянальную культуру, этнас і соцыум" (У.Ф. Валадзько). На ўроках літаратуры праз змест і сродкі навучання школьнікі ўключаюцца ў працэс асэнсавання такіх каштоўнасцей, як этнамова, гісторыя Айчыны, прырода роднага краю, фальклор, нацыянальнае мастацтва, народны каляндар, сямейна-бытавая культура, вывучэнне радаводу, народныя традыцыі, нацыянальны характар, нацыянальная сімволіка і геральдыка як увасабленне гістарычнай памяці, -- якія і ёсць працэс фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці. Ён

## Спіс прац, апублікаваных па тэме дысертацыі

*Вучэбна-метадычныя дапаможнікі*

1. Барадзіна А.І. Фарміраванне гістарычнай свядомасці школьнікаў пры вывучэнні рамана У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім"/ Баранав. дзярж. выш. пед. каледж. – Баранавічы, 1999. – 62 с.

*Артыкулы ў зборніках*

2. Барадзіна А.І. Прыярытэт асобаснага падыходу ў выкладанні літаратуры // Новые технологии в системе непрерывного образования: Сб. науч. ст.: По итогам работы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 30-31 мая 1995 г.: В 3 т. / Ин-т повышения квалификации и переподгот. руководящих работников и специалистов образования; Под ред.: А. И. Жука, А. В. Казулина. – Минск, 1995. – Т. 3. -- С. 540 – 545.

*Артыкулы ў навуковых часопісах*

3. Барадзіна А.І. "Каб праца дала жаданы плён..." // Бел. мова і літ. у школе. – 1988. – № 4. – С. 8 — 10.
4. Барадзіна А.І. Жыццё і трагедыя Міхася Чарота // Бел. мова і літ. у школе. – 1991. – № 11. – С. 16 – 20.
5. Барадзіна А.І. Homo humanus // Адукацыя і выхаванне. – 1993. -- №7 -- 8. – С. 112 – 118.
6. Барадзіна А.І. Увасабленне нацыянальнай адметнасці беларусаў у аповесці В. Быкава "Знак бяды" // Роднае слова. – 1998. -- №7. -- С. 63 – 70; №8. – С. 109 – 116.
7. Бородина А. И. "Родные корни" (проблема исторического сознания в "Комаровской хронике" М. Горецкого) // Нёман. – 1998. -- №11 – 12. – С. 258 – 264.
8. Барадзіна А.І. Выяўленне гуманістычнага патэнцыялу творчасці Міхася Лынькова (апавяданне "Сустрэчы") // Бел. мова і літ. – 1999. -- №2. – С. 62 – 68.

*Матэрыялы канферэнцый*

9. Барадзіна А.І. Выяўленне нацыянальна-патрыятычнага і сацыяльна-філасофскага аспектаў вобраза беларускага інтэлігента пры вывучэнні прозы М. Гарэцкага // Гарэцкія чытанні: Матэрыялы дакл. і паведамл. першых міжнар. чытанняў, Мінск, 23-24 крас., 1996 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Дзярж. музей гіст. бел. літ.; Пад рэд.: І.А. Брыля і інш. -- Мінск, 1997. – С. 69 – 71.

10. Барадзіна А.І. Актыўныя формы выкладання літаратуры як сродак фарміравання гістарычнай свядомасці школьнікаў // Распрацоўка новых тэхналогій адукацыі: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф.: У 2 ч. / Баранав. дзярж. выш. пед. каледж; Пад рэд.: А.А. Грымаця і інш. – Баранавічы, 1997. – Ч. 2. – С. 247 -- 248.

11. Барадзіна А.І. Праблема мастацкай праўды як прадмет вучэбнага даследавання // Развитие учебного заведения средствами научно-исследовательской и научно-методической работы: Тез. материалов респ. науч.-практ. конф., Барановичи, 4-5 мая 1999 г. / Баранов. гос. высш. пед. колледж; Отв. ред. Л.Ф. Мирзаянова. – Барановичи, 1999. -- С. 147 – 150.

# РЭЗЮМЕ

**Барадзіна Алена Іванаўна**

## Фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў пры вывучэнні літаратуры ( на матэрыяле твораў У. Караткевіча)

Ключавыя словы: гісторыка-патрыятычная свядомасць; кампаненты гісторыка-патрыятычнай свядомасці; узроўні сфарміраванасці гісторыка-патрыятычнай свядомасці; міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі; сродкі спасціжэння аўтарскай пазіцыі і канцэпцыі чалавека; асобасныя адносіны да мастацкага твора; гуманістычныя прынцыпы вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Аб'ект даследавання – фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці вучняў сярэдніх школ Рэспублікі Беларусь у працэсе літаратурнай адукацыі.

Прадмет даследавання: агульныя і спецыфічныя метады і прыёмы працэсу фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці вучняў 5 – 11 класаў сярэдніх школ на ўроках беларускай літаратуры пры вывучэнні творчасці У. Караткевіча.

Мэта даследавання – стварэнне асобасна скіраванай метадычнай сістэмы вывучэння творчасці У. Караткевіча ў 5 – 11 класах, якая забяспечвае большую эфектыўнасць працэсу фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў.

У дысертацыі раскрыты сэнс паняцця "гісторыка-патрыятычная свядомасць"; акрэслена структура гэтага феномена і сувязь яго з іншымі пластамі свядомасці асобы; выяўлены сучасны ўзровень гісторыка-патрыятычнай свядомасці ў вучняў сярэдняй школы і вызначаны найбольш выніковыя шляхі, метады і прыёмы рэалізацыі мэт даследавання; распрацавана сістэма вывучэння творчасці У. Караткевіча ў сярэдняй школе, якая забяспечвае гуманістычны характар навучання і выхавання. Вынікі даследавання ў сукупнасці з яго матэрыялам абумоўліваюць навуковую навізну дысертацыйнай працы і могуць быць выкарыстаны ў навучальным працэсе сярэдніх школ, на занятках па методыцы выкладання літаратуры ў ВНУ, пры стварэнні вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

# РЕЗЮМЕ

**Бородина Елена Ивановна**

## Формирование историко-патриотического сознания школьников при изучении литературы (на материале произведений В. Короткевича)


Ключевые слова: историко-патриотическое сознание; компоненты историко-патриотического сознания; уровни сформированности историко-патриотического сознания; межпредметные и внутрипредметные связи; средства постижения авторской позиции и концепции человека; личностное отношение к художественному произведению; гуманистические принципы учебно-воспитательного процесса.

Объект исследования: формирование историко-патриотического сознания учащихся средних школ Республики Беларусь в процессе литературного образования.

Предмет исследования: общие и специфические методы и приемы процесса формирования историко-патриотического сознания учащихся 5 – 11 классов средних школ на уроках белорусской литературы при изучении творчества В. Короткевича.

Цель исследования – создание личностно направленной методической системы изучения творчества В. Короткевича в 5 – 11 классах, которая обеспечивает большую эффективность процесса формирования историко-патриотического сознания школьников.

В диссертации раскрыто содержание понятия "историко-патриотическое сознание"; выявлена структура этого феномена и его связи с другими пластами сознания личности; выявлено состояние сформированности историко-патриотического сознания у учеников средней школы на современном этапе и определены наиболее результативные пути, методы и приёмы изучения творчества В. Короткевича в средней школе. Приоритетными являются методы и приемы формирования сознания, приемы исследовательского и творческого характера, имитационно-моделирующая игра, диспут.

Результаты исследования в совокупности с его материалом реализованы в учебно-методическом пособии и могут быть использованы в учебном процессе средних школ, и в курсе преподавания дисциплины "Методика преподавания белорусской литературы в школе " для студентов вузов.

## SUMMARY

**Borodina Elena Ivanovna**

**Moulding of school children's historical-patriotic consciousness while studying literature (by the example of V. Korotkevich's works)**

Key-words: historical-patriotic consciousness; components of historical-patriotic consciousness; levels of moulding of historical-patriotic consciousness; links within a subject and among subjects; means of catching the author's point and conception of man; individual attitude towards the work of art; humanistic principles of the process of study.

The object of investigation: Moulding of historical-patriotic consciousness of schoolchildren at secondary schools in the Republic of Belarus in the process of literary education.

The subject of investigation: common and specific methods and ways of forming of historical-patriotic consciousness of pupils of 5 – 11 forms of secondary schools at the lessons of the Belorussian literature while studying V. Korotkevich's creative work.

The aim of investigation: creation of individually orientated methodological system of V. Korotkevich's creative work study in the 5 – 11 forms providing high effectiveness of schoolchildren's historical-patriotic consciousness moulding.

In the dissertation the concept " historical-patriotic consciousness" is defined; the structure of this phenomenon has been identified as well as its ties with other layers of an individual's consciousness; there has been explored the state of formation of historical-patriotic consciousness of schoolchildren at secondary schools at present and there have been singled out the most efficient ways, methods and means of V. Korotkevich's works study in a secondary school. Methods and ways of consciousness moulding, tasks of research and creative character, imitation modeling role-play and debate are prior.

The results of the investigation and its materials hare been realized in a textbook and can be used in the educational process at secondary schools, at the classes in methods of teaching literature at higher educational institutions.